УДК 340.12

А. Ф. ВІШНЕЎСКІ

# АНДРЭЙ ВЫШЫНСКІ: ВІТКІ КАР'ЕРЫ – МУДРАГЕЛІСТЫ І НЕЧАКАНЫ

*Характарызуецца дзейнасць А. Я. Вышынскага ў 1920-х – пачатку 1950-х гадоў, даецца ацэнка яго абвінаваўчых прамоў на так званых маскоўскіх палітычных працэсах, якія не вытрымліваюць крытыкі ні з юрыдычнага, ні з маральнага пунктаў гледжання, таму што яны не абапіраюцца на моцную доказную базу і напоўненыя грубымі, зневажальнымі выказваннямі на адрас падсудных.*



**ВІШНЕЎСКІ**
**Аляксей Фёдаравіч**,
доктар гістарычных навук, прафесар права, прафесар кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Акадэміі МУС Рэспублікі Беларусь

A. F. VISHNEVSKY

# ACTIVITIES OF THE PROSECUTOR A. VYSHINSKY WITHIN THE CONTEXT OF STRENGTHENING THE SOVIET POLICY OF LEGAL REGIME

*The article characterizes activity A. Vyshinsky in the 20's – early 50-ies of the last century and assesses his convictions speeches on the so-called Moscow's political processes, that neither from legal nor from moral point of view does not hold water, because they do not rely on a strong evidence base and were filled with rude.*

## Уводзіны

У розныя часы існавання Савецкага Саюза органы пракуратуры ўзначальвалі адзінаццаць чалавек: пракурор Вярхоўнага суда СССР П. А. Красікаў, пракуроры Саюза ССР І. А. Акулаў, А. Я. Вышынскі, М. І. Панкратаў і В. М. Бачкоў, генеральныя пракуроры СССР К. П. Гаршэнін, Г. М. Сафонаў, Р. А. Рудэнка, А. М. Рэкункоў, А. Я. Сухараў і М. С. Трубін.

Калі кінуць беглы позірк на біяграфіі названых асоб, то можна заўважыць, што кожная з іх самабытная і непадобная на свайго папярэдніка. Некаторыя з пракурораў клапаціліся аб захаванні законнасці ў краіне, змагаліся за яе ўмацаванне па меры сваіх сіл і магчымасцяў, таленту і здольнасцяў. Хтосьці падымаўся на вяршыню пракурорскай улады павольна – прыступка за прыступкай, пераадольваючы іерархічную лесвіцу, хтосьці хутка і імгненна. Апошняе тычылася імені, якое стаіць ў назве прапануемага артыкула і не мае патрэбы ў прадстаўленні: яно гаворыць само за сябе.

Выбар тэмы стаў не толькі індэксам аўтарскіх прыхільнасцяў, але і фактам палітычнага, сацыяльнага, прававога жыцця грамадства ў постсавецкіх краінах у стогадовы юбілей так званай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У артыкуле ставіцца адна мэта – паказаць хаця б некаторыя бакі суровай драмы народа, звязаныя з парушэннем законнасці, пабудзіць у грамадскай свядомасці разуменне несумяшчальнасці гэтай з'явы з ідэаламі гістарычнага прагрэсу, гуманізму і сацыяльнай справядлівасці.

## Асноўная частка

Андрэй Януар'евіч Вышынскі, продкі якога паходзяць са старажытнага польскага роду Вышынскіх, нарадзіўся ў Адэсе 28 лістапада 1883 г., ў сям'і правізара, а ў пачатку 1890-х гадоў яго бацькі пераехалі у Баку, дзе працягвалі займацца аптэчнай справай.

Матэрыялы, змешчаныя ў розных даведніках, даюць падставу сцвярджаць, што біяграфія Вышынскага складзена з хітра падабраных дадзеных: высвечваюцца адны факты і зацямняюцца другія. Вядома, што ў 17-гадовым узросце ён бліскуча скончыў мужчынскую класічную гімназію ў Баку і ў 1901 годзе паступіў на юрыдычны факультэт Кіеўскага ўніверсітэта, адкуль за нядобранадзейнасць у сакавіку 1902 года быў выключаны. У 1903 годзе ўступіў у бакінскую арганізацыю РСДРП, а ў 1908 годзе быў асуджаны да аднаго года пазбаўлення волі. Зняволенне адбываў у Баілаўскай турме, дзе тады знаходзіўся вядомы рэвалюцыянер Коба (Іосіф Вісарыёнавіч Джугашвілі), і нейкі час яны нават сядзелі ў адной камеры [1, с. 233].

Вышынскаму ўдалося зноў стаць студэнтам юрыдычнага факультэта Кіеўскага ўніверсітэта, які ён скончыў ў 1913 годзе, і праз два гады ў Маскве паступіў памочнікам да вядомага адваката Паўла Мікалаевіча Малянтовіча – чалавека з ярка выяўленымі ліберальна-дэмакратычнымі перакананнямі.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі Вышынскі становіцца старшынёй Якіманскай раённай управы г. Масквы і камісарам міліцыі, старанна выконвае ўсе загады Часовага ўрада, у тым ліку па вышуку і арышце У. І. Леніна. З перамогай Кастрычніцкай рэвалюцыі у адрозненне ад многіх сваіх саратнікаў-меншавікоў Вышынскі не выступаў адкрыта супраць новай улады. Захаваўся толькі адзін дакумент, дзе ён пакінуў сляды незадаволенасці ёю: подпіс пісьма групы меншавікоў, накіраванага ў 1919 годзе Леніну, у якім яны патрабавалі палітычных свабод, спынення рэпрэсій і г. д. [2, с. 139].

Чаму з прыходам да ўлады бальшавікоў Вышынскі не робіць спробы ўступіць у шэрагі кіруючай палітычнай партыі? Справа ў тым, што ён быў не толькі адукаваным, але і вельмі асцярожным чалавекам. Да 1920 года адчування непадзельнай перамогі бальшавікоў не было і прыналежнасць да меншавіцкай партыі Андрэя Януар'евіча не турбавала. З паспяховым заканчэннем

Грамадзянскай вайны, разгромам замежных інтэрвентаў стала ясна: бальшавікі перамаглі. Таму ў 1920 годзе Андрэй Януар'евіч падае заяву аб прыёме ў шэрагі РКП(б). Замаскварэцкі райкам даволі хутка задаволіў просьбу, з чаго можна зрабіць выснову, што Вышынскі меў падтрымку якойсьці высокай асобы. Ёсць падставы далучыцца да меркавання прафесара Пітэра Саламона, што гэтым дабрадзеем быў сам Сталін [3, с. 152].

Запозненае ўступленне ў шэрагі камуністычнай партыі пазней наганяла жаху Вышынскаму, бо Сталін добра разумеў, якой стрэмкай сядзіць і будзе сядзець у свядомасці былога меншавіка далікатны эпізод – падпісанае распараджэнне аб вышуку, арышце і аддачы пад суд У. І. Ульянава (Леніна).

Пералом у кар'еры Андрэя Януар'евіча наступае ў 1923 годзе, калі ён выступіў у якасці грамадскага абвінаваўцы на адным з буйных працэсаў «царкоўнікаў». Пракурорская трыбуна прыйшлася Вышынскаму даспадобы, і неўзабаве ён становіцца пракурорам крымінальна-судовай калегіі Вярхоўнага суда РСФСР, актыўна займаецца навукай, публікуе артыкулы і кнігі: «Нарысы па гісторыі камунізма» (1924), «Суд і карная палітыка Савецкай улады» (1925) і інш. У 1925 годзе савет Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта абраў Вышынскага рэктарам. У МДУ ён адначасова чытаў лекцыі па крымінальным працэсе, на аснове якіх падрыхтаваў падручнік «Курс крымінальнага працэса».

Кар'ера Андрэя Януар'евіча як юрыста стала развівацца па ўзыходзячай лініі з 1928 года, калі ён становіцца старшынёй спецыяльнай камісіі Вярхоўнага суда па «шахцінскай справе», затым па справе так званай Прампартыі. Менавіта на шахцінскім працэсе было кінута тое зерне, якое ў хуткім часе прарасце і дасць багатыя ўсходы: усю ўвагу суд сканцэнтраваў не на аналізе доказаў, а на ўменні дабівацца ад падсудных пацверджанняў прызнання імі сваёй віны. Месца дзяржаўнага абвінаваўцы на «шахцінскім працэсе» заняў сапернік Вышынскага Мікалай Крыленка. Успаміны відаводчцаў малююць нам псіхалагічныя партрэты двух стаўпоў савецкай юрыспрудэнцыі таго часу: «Крыленка прылюдна глуміўся з ахвяр, тады як Вышынскі, наадварот, даціскаў іх логікай, пададзенай у форме вытанчанай карэктнасці… Вышынскі лавіраваў, імкнучыся паказаць сябе незалежным, аб'ектыўным і дэмакратычным суддзёй» (Пераклад мой. – *А. В.*) [4, с. 29-30]. Але, бадай, самай важнай знаходкай Андрэя Януар'евіча на судовым працэсе па «шахцінскай справе» з'яўляецца тэзіс пра тое, што «савецкі суд – гэты найадказнейшы орган пралетарскай дыктатуры – павінен зыходзіць і заўсёды зыходзіць выключна з меркаванняў дзяржаўнай і гаспадарчай мэтазгоднасці» (Пераклад мой. – *А. В.*) [4, с. 31]. Тым самым, не прадбачачы яшчэ 1937 года, ён чуйна ўлавіў палітычны заказ у адносінах да савецкай судовай машыны. Шахцінскі працэс «з'явіўся своеасаблівым выпрабавальным палігонам для новай тэхнікі – для абвінавачанняў, заснаваных на так званых прызнаннях падсудных, гэта значыць непраўдзівых самаабгаворах, здабытых тэрарыстычнымі метадамі» (Пераклад мой. – *А. В.*) [5, с. 135].

25 лістапада – 7 снежня 1930 г. у Маскве адбыўся чарговы публічны працэс над групай спецыялістаў, якія абвінавачваліся ў шкодніцтве і контррэвалюцыйнай дзейнасці, – працэс Прампартыі. Да суда было прыцягнута восем чалавек: Л. К. Рамзін – дырэктар Усесаюзнага цеплатэхнічнага інстытута, а таксама спецыялісты ў галінах тэхнічных навук і планавання В. А. Ларычаў, І. А. Каліннікаў, І. Ф. Чарноўскі і інш. Рамзін і яго таварышы былі прадстаўленыя як агенты прэзідэнта Францыі, англійскага разведчыка палкоўніка Томаса Лоўрэнса і іншых імперыялістаў. Адметная і злавесная асаблівасць працэса – ўсе падсудныя прызналіся ў прад'яўленых абвінавачаннях. Асаблівае ўражанне гэта выклікала ў правазнаўцаў заходніх краін і наогул людзей, правасвядомасць якіх была выпрацавана на класічных уяўленнях пра правасуддзе: прызнанне абвінавачаных як бы выключала магчымасць спрэчкі аб віне; многім у галаву не магло прыйсці, што прызнанне ў судзе бывае не толькі свабодным і добраахвотным… На працэсе Прампартыі Вышынскі ўмела ўваходзіў у вобраз таго дзяржаўнага абвінаваўцы, які ў хуткім часе пакажа сябе на вялікіх маскоўскіх працэсах [6, с. 156–159].

11 мая 1931 г. Вышынскі быў прызначаны пракурорам РСФСР. Ён змяніў на гэтай пасадзе М. В. Крыленку. Праз дзесяць дзён Вышынскі становіцца адначасова і намеснікам наркама юстыцыі РСФСР. У чэрвені 1933 года пасля стварэння Пракуратуры СССР А. Я. Вышынскага прызначылі намеснікам пракурора, а з сакавіка 1935 года ён ужо пракурор Саюза ССР. Пра яго загаварылі як пра новую ўзыходзячую зорку на савецкім юрыдычным небасхіле. Ніводная важная падзея ў праваым жыцці краіны, былі гэта нарады, актывы ці судовыя працэсы, асабліва па палітычных справах, не абыходзілася без яго ўдзелу. Асабліва паказальнае выступленне Вышынскага па пытаннях судовай палітыкі і судовай работы на пленуме Вярхоўнага суда СССР у сакавіку 1936 года, на якім ён падверг знішчальнай крытыцы даклад старшыні Вярхоўнага суда Вінакурава, назваўшы яго «статыстычна-бухгалтарскай», а не палітычнай справаздачай, таму што ў ёй, па меркаванні Вышынскага, не былі «выдзеленыя вузлавыя пытанні судовай палітыкі», не было «асноўнага стрыжня». Не спадабаліся яму таксама даклад дырэктара Інстытута крымінальнай палітыкі Шляпачнікава, які «нічога не даў», і выступленне наркама юстыцыі Саюза ССР Крыленкі. Выступленне старшыні калегіі Вярхоўнага суда СССР Антонава-Саратаўскага ў спрэчках Вышынскі назваў «дзіўным», а змест яго прамовы – «цяжкаўлоўным».

Вышынскі быў адным з нямногіх савецкіх пракурораў, хто не цураўся судовай трыбуны, з асалодай выступаў на судовых працэсах, адчуваючы сябе упэўнена і натуральна. Усе пракуроры да Вышынскага, акрамя М. В. Крыленкі, і пасля яго (за выключэннем Р. А. Рудэнкі) не вельмі любілі судовую трыбуну.

Аднак у свеце Вышынскага ведалі перш за ўсё як «пракурора маскоўскіх палітычных працэсаў», на якіх ён выступаў у 1936–1938 гадах. Асабліва выдзяляюцца тры такія працэсы.

Справа Антысавецкага аб'яднанага трацкісцка-зіноўеўскага блока разглядалася Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 19–24 жніўня 1936 г. У судо-

вым пасяджэнні яна называлася «справа трацкісцка-зіноўеўскага тэрарыстычнага цэнтра». Пад суд былі аддадзены 16 чалавек: Р. Я. Зіноўеў, Л. Б. Каменеў, Г. Е. Еўдакімаў, І. І. Рэйнгольд, Р. В. Пікель, Е. А. Драйцэр і інш. Сваю прамову А. Я. Вышынскі завяршыў так: «Я хачу закончыць напамінам вам, таварышы суддзі, пра тыя патрабаванні, якія прад'яўляе закон у справах аб найцяжэйшых дзяржаўных злачынствах. Я дазваляю сабе напомніць пра ваш абавязак: прызнаўшы гэтых людзей, усіх шаснаццаць, вінаватымі ў дзяржаўных злачынствах, прымяніць да іх у поўнай меры і тыя артыкулы закону, якія прад'яўлены ім абвінавачаннем. Ашалелых сабак я патрабую расстраляць – усіх да аднаго» (Пераклад мой. – *А. В.*) [7, с. 406]. Усе, хто праходзіў па справе, былі асуджаны да вышэйшай меры пакарання.

Справа аб так званым Паралельным антысавецкім трацкісцкім цэнтры разглядалася Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 23–30 студзеня 1937 г. У судзе яна праходзіла пад назвай «Справа антысавецкага трацкісцкага цэнтра». Былі аддадзены пад суд 17 чалавек: Ю. П. Пятакоў, Р. Я. Сакольнікаў, К. Б. Радэк, В. В. Арнольд, М. С. Страілаў, Я. А. Ліўшыц, І. А. Князеў, А. А. Шастоў і інш. Сваю прамову Вышынскі закончыў наступнымі словамі: «Я абвінавачваю не адзін! Я абвінавачваю разам з усім нашым народам, абвінавачваю найцяжэйшых злачынцаў, якія заслугоўваюць адной толькі меры пакарання – расстрэл, смерць» (Пераклад мой. – *А. В.*) [7, с. 462]. Да расстрэлу прыгаварылі 13 падсудных. Р. Я.Сакольнікаву, В. В. Арнольду і К. Б. Радэку прызначылі турэмнае зняволенне тэрмінам 10 гадоў, М. С. Страілаву – 8 гадоў зняволення ў турме. У маі 1939 года Р. Я. Сакольнікаў і К. Б. Радэк былі забітыя сукамернікамі ў турме, а ў 1941 годзе В. В. Арнольд і М. С. Страілаў па завочна вынесеным прысудзе былі расстраляныя [8, с. 34, 42].

2–13 сакавіка 1938 г. калегіяй Вярхоўнага суда СССР разглядалася справа Антысавецкага права-трацкісцкага блока. Пад суд быў аддадзены 21 чалавек: М. І. Бухарын, А. І. Рыкаў, Г. Г. Ягода, А. П. Розэнгольц, М. А. Чарноў, І. А. Зялінскі, В. Ф. Шаранговіч і інш. Большасць падсудных (18 чалавек) была таксама прыгавораная да расстрэлу [7, с. 464–538].

Пра названыя і іншыя маскоўскія працэсы, пра метады вядзення «следства», пра выбіванне прызнальных паказанняў у абвінавачаных, а затым і ў падсудных, фальсіфікацыі і падлогі, а таксама пра ролю ва ўсім гэтым Вышынскага напісана даволі шмат, у тым ліку і аўтарам артыкула. Усе гэтыя справы перагледжаныя, прысуды па іх адмененыя, а асобы, якія па іх праходзілі, за выключэннем Г. Г. Ягоды, рэабілітаваныя.

Вышынскі адхіліў пракурорскі нагляд за законнасцю ў дзейнасці органаў дзяржбяспекі па справах аб дзяржаўных злачынствах (па просьбе Берыі). Усялякія спробы пракурораў пратэставаць супраць беззаконнасці падаўляліся ім. Многія пракуроры самі былі аб'яўленыя «ворагамі народа». Сярод ахвяр самавольства быў і першы пракурор СССР А. Акулаў, які займаў гэтую пасаду з 1933-га па 1935 год. Ад самавольства Вышынскага пацярпелі і многія ваенныя пракуроры, у тым ліку па яго прамым ўказанні 74 чалавекі, за тое, што не давалі пры адсутнасці для таго дастатковых падстаў санкцый на арышт асоб, што знаходзіліся на ваеннай службе [9, с. 124].

У Нацыянальным архіве Беларусі захавалася тэлеграма, якую 17 красавіка 1938 г. Вышынскі накіраваў пракурорам саюзных рэспублік, краёў і абласцей. У ёй гаварылася, што ў сувязі з запытамі шэрагу пракурораў аб парадку разгляду скаргаў па справах праверку правільнасці асуджэння неабходна праводзіць толькі ў выключных выпадках… Ва ўсіх астатніх выпадках трэба было паведамляць тым, хто скардзіўся, што справа пераглядацца не будзе, што прынятае рашэнне з'яўлялася канчатковым [10, с. 169]. Усё гэта стварала надзвычай спрыяльныя ўмовы для хуткага распаўсюджвання беззаконня на месцах.

У разгледжаны перыяд распаўсюджанай з'явай была фальсіфікацыя спраў следчымі органамі. Так, былыя следчыя па найважнейшых справах Пракуратуры СССР Л. Б. Шэйнін і М. Ю. Рагінскі, якія разам з Вышынскім ўдзельнічалі у допыце абвінавачаных, у сваіх тлумачэннях у пачатку 1960-х гадоў паведамлялі, што так званыя перадопыты Вышынскім насілі фармальны характар, яму прад'яўляліся толькі пратаколы допытаў, а з усімі матэрыяламі справы, як належала паводле закона, не знаёміліся. Вышынскі па сваім меркаванні карэкціраваў заключэнні экспертызы [8, с. 41]. Больш за тое, па асабліва важных палітычных справах варыянты абвінаваўчага заключэння пасылаліся асабіста Сталіну і некалькі разоў перараблялiся згодна з яго ўказаннямі. Напрыклад, 9 студзеня 1937 г. А. Я. Вышынскі і М. І. Яжоў у суправаджальным пісьме Сталіну адзначалі: «Накіроўваем перароблены, згодна з Вашымі указаннямі, праект абвінаваўчага заключэння па справе Пятакова, Сакольнікава, Радэка і іншых» (Пераклад мой. – *А. В.*) [8, с. 42].

Пра тое, што ў 1930-я гады незаконны шлях для атрымання прызнанняў падследных стаў пераважным, прыйшлі практычна ўсе даследчыкі, у тым ліку і такія вядомыя юрысты, як акадэмік У. Кудраўцаў і прафесар А. Трусаў. Прычынамі гэтага «былі … павышаная ўнушальнасць; боязь насілля з боку следчых; вера ў абяцанне аблегчыць свой лёс у выпадку прызнання віны і г. д. У палітычных справах усе яны мелі месца» (Пераклад мой. – *А. В.*) [11, с. 234–235]. Як сведчаць факты, у разглядаемы перыяд прынцып прэзумпцыі невінаватасці быў адхілены, выбітае прызнанне аб'яўлялася «царыцай доказаў». У тых жа выпадках, калі незаконныя спосабы не спрацоўвалі, суддзі маглі вынесці прыгавор, кіруючыся сваім «рэвалюцыйным сумленнем».

У абвінаваўчых прамовах на судовых пасяджэннях па справах Каменева –Зіноўева, Пятакова – Радэка, на бухарынскім і іншых працэсах атмасфера суда і стыль пракурора Вышынскага добра адчуваюцца ў тых ідэалагемах, якія ён выказваў у адносінах да падсудных: «смярдзючая куча чалавечых адкідаў», «самыя страшныя, самыя адпетыя і разбэшчаныя, несумленныя элементы», «агідная куча авантурыстаў», «ашалелыя сабакі», якіх «трэба расстраляць усіх да аднаго», «праклятая помесь лісы і свінні» (пра Бухарына) і да т. п. У пракурора Саюза ССР падсудныя не гавораць, а «каркаюць», «рохкаюць», «гаўкаюць». Час ад часу гэты паток лаянкі змяняўся лірычнымі адступленнямі, якія плаўна пераходзілі ў новыя выкрывальныя тырады, і завяршалася прамова

панегірыкамі ў адрас кіраўніка дзяржавы. Яркім пацвярджэннем апошняга з'яўляюцца словы Вышынскага, сказаныя ім у канцы працэса так званага Антысавецкага права-трацкісцкага блока. «Уся наша краіна, – гаварыў пракурор Саюза ССР, – ад малога да старога, чакае і патрабуе аднаго: здраднікаў і шпіёнаў, прадаўшых ворагу нашу Радзіму, расстраляць як паганых сабак! Патрабуе наш народ аднаго: раздавіць праклятую гадзіну! Пройдзе час. Магілы ненавісных здраднікаў зарастуць бур'янам і чартапалохам, пакрытыя вечнай пагардай сумленных савецкіх людзей, усяго савецкага народа. А над намі, над нашай шчаслівай краінай, па-ранейшаму ясна і радасна будзе зіхацець сваімі светлымі промнямі наша сонца. Мы, наш народ, будзем па-ранейшаму крочыць па ачышчанай ад апошняй нечысці і погані мінулага дарозе, на чале з нашым любімым правадыром і настаўнікам – вялікім Сталіным – наперад і наперад, да камунізму» (Пераклад мой. – *А. В.*) [7, с. 538].

Знявагаю і прыніжэннем, а не толькі фізічным знішчэннем звергнутых, Вышынскі стварыў зусім невядомы тып крымінальнага працэсу: якія неабходны доказы віны, калі размова ідзе пра «ашалелых сабак», «смярдзючую падлу» і г. д. Здзекуючыся з загнаных на лаву падсудных былых членаў Палітбюро ЦК ВКП(б), бальшавікоў, прайшоўшых царскую катаргу, турмы і ссылкі, з тых, хто не мог адказаць, не прадстаўляючы сур'ёзных доказаў, Вышынскі ўрачыста падводзіў вынік: «...вельмі важкія і пераканаўчыя доказы!» (Пераклад мой. – *А. В.*) [12, с. 13]. Ненатуральнасць, перадузятасць у ацэнцы прадстаўленых доказаў прасочваюцца практычна ва ўсіх буйных адкрытых палітычных працэсах 1930-х гадоў. Так, у абвінаваўчай прамове на працэсе Паралельнага антысавецкага трацкісцкага цэнтра Вышынскі сцвярджаў, што першым доказам віны падсудных з'яўляецца «гістарычная сувязь, якая пацвярджае абвінаваўчыя тэзісы на падставе мінулай дзейнасці трацкістаў». Тым самым замест рэальных фактаў таго часу, да якога адносіцца абвінавачанне, прапаноўвалася ацэньваць мінулае, ад якога абвінавачаныя самі ж адмовіліся. На працэсе па справе антысавецкага права-трацкісцкага блока абвінавачанне Бухарына ў саўдзеле ў замаху на жыццё Леніна эсэркі Каплан у 1918 годзе фарміравалася наступным чынам. Пасля таго як Бухарын удзелу ў гэтым замаху не прызнаў, быў выкліканы сведка Асінскі, які сказаў: «У канцы 1918 г. у нас са Стукавым зайшла размова пра стан Леніна пасля ранення... Стукаў наконт гэтага сказаў наступнае: "А ці ведаеце вы, што выстрал Каплан з'яўляецца не толькі вынікам дырэктывы, дадзенай ЦК партыі правых эсэраў, але таксама прамым вынікам тых мерапрыемстваў, якія былі ў свой час намечаныя блокам для звяржэння ўрада, і ў прыватнасці, устаноўкі на ўмярцвенне правадыроў урада"» (Пераклад мой. – *А. В.*) [13, с. 308]. Стукаў дапрошаны не быў, словы Асінскага суд прыняў. У заключнай прамове Вышынскі ўжо прама сцвярджаў: «Пытанне аб тэрарыстычным акце супраць Леніна было ўзнята ў 1918 годзе не кім іншым, як менавіта Бухарыным» (Пераклад мой. – *А. В.*) [13, с. 308]. «Устаноўлена, – сказана ў прыгаворы Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР, – што ўчынены эсэркай Каплан 30 жніўня 1918 года замах на жыццё У. І. Леніна з'явіўся прамым вынікам злачынных намераў "левых камуністаў" на чале з Бухарыным і іх саўдзельнікаў "левых" і "правых" эсэраў» (Пераклад мой. – *А. В.*) [13, с. 382]. Так ад агульных тэарэтычных разважанняў, што мелі месца за дваццаць гадоў да суда, пракладвалася кладка да канкрэтнага замаху, за які абвінавачаны прыгаворваўся да вышэйшай меры пакарання. Прывядзём яшчэ некаторыя прыклады «доказаў». Калі памочнік Вышынскага, стары бальшавік А. Сольц запатрабаваў у яго матэрыялы па справе Трыфанава (бацькі пісьменніка Ю. Трыфанава), сказаўшы пры гэтым, што ён не верыць у тое, што Трыфанаў – вораг народа, пракурор Саюза ССР сказаў: «Калі органы ўзялі, значыць, вораг» (Пераклад мой. – *А. В.*) [14, с. 194]. У пачатку 1937 года ў Мінску арыштавалі майстра Міністэрства будаўніцтва Б. А. Пашкоўскага нібыта за ўдзел у контррэвалюцыйнай арганізацыі, у якую залічылі 16 чалавек, у тым ліку сыноў былога прэзідэнта АН БССР, члена Бюро ЦК КП(б)Б У. М. Ігнатоўскага Валянціна і Юрыя. Пры слуханні справы 26–27 мая 1937 г. на пасяджэнні Ваеннага трыбунала БВА абвінавачаныя адмовіліся ад прызнанняў, зробленых на папярэднім следстве, заявіўшы, што ніякай контррэвалюцыйнай арганізацыі наогул не было. Паказанні запісваліся не з іх слоў, а на высновах тых, хто праводзіў допыты. Якіх-небудзь дадатковых доказаў вінаватасці арыштаваных пры даследаванні справы атрымана не было. Тым не менш без доказаў віны справу Б. А. Пашкоўскага і іншых накіравалі на разгляд камісара ўнутраных спраў СССР Яжова і пракурора СССР Вышынскага, і тыя пастановай ад 22 верасня 1937 г. прыгаварылі ўсіх да расстрэлу. Прыгавор быў прыведзены ў выкананне [15, с. 39].

Вось якую характарыстыку Вышынскаму і яго прамовам на судовых працэсах дае А. Ваксберг. «Бяспрыкладнае спалучэнне акадэмізму, вучонасці, амаль фарсістай адукаванасці са зневажальнай лаянкай, якая вылятае з вуснаў настолькі натуральна, нібы гэта грымучая сумесь стала нормай, паўсядзённым жаргонам. І лаянка да таго ж была няпростая – кожнае зняважлівае слова набывала афарбоўку злавесную. Бо сэнс, у яго ўкладзены, меў палітычную аснову» (Пераклад мой. – *А. В.*) [12, с. 13].

У канцы 1970-х гадоў для мяне абвінаваўчыя прамовы Вышынскага ўяўляліся крыніцай юрыдычнай мудрасці і судовага красамоўства. Вырашыў вярнуцца да іх зноў і акунуўся ў цяжкую атмасферу тых гадоў. У яго кнізе «Судовыя прамовы» (1948) асаблівую ўвагу звяртае на сябе справа Антысавецкага трацкісцкага цэнтра і справа антысавецкага права-трацкісцкага блока. Галоўнае месца ў выступленнях дзяржаўнага абвінаваўцы аддаецца гістарычным, агульнапалітычным, ідэалагічным пытанням з багатым цытаваннем прац Леніна, Сталіна, мысліцеляў далёкага мінулага, матэрыялаў партыйных з'ездаў, з'ездаў Саветаў, партканферэнцый, характарыстыцы вучэння аб магчымасці перамогі сацыялізму ў адной асобна ўзятай краіне і інш. Што датычыцца працэсуальных пытанняў, то па справе антысавецкага трацкісцкага цэнтра з 56 старонак ім прысвечана 4,5 старонкі, а па справе антысавецкага права-трацкісцкага блока з 74 старонак юрыдычным пытанням адведзена толькі тры. Такія суадносіны характэрныя і для іншых спраў, на якіх А. Я. Вышынскім быў дзяржаўным абвінаваўцам ў 1930-я гады.

Такім чынам, прамовы Вышынскага па палітычных справах нічога агульнага не мелі са звычайнымі судовымі прамовамі дзяржаўных абвінаваўцаў, дзе патрабуецца скрупулёзны аналіз доказаў, якія выкрываюць вінаватых асобаў. Вышынскі не турбаваў сябе глыбокім даследаваннем віны падсудных. Ён толькі надаваў сваім прамовам публіцыстычны характар і патрэбную на той час палітычную афарбоўку. А што датычыць прадстаўлення суду доказаў, то гэтага тады зусім і не патрабавалася, бо прысуды фактычна былі ўжо прадвырашаныя і нават не Вышынскім.

Дзеля навуковай аб'ектыўнасці неабходна сказаць, што лаянка, якая была характэрная для Вышынскага, замест сур'ёзных доказаў прагучала спачатку не ў зале судовых пасяджэнняў, а на старонках савецкага друку. Менавіта там – да суда і замест суда – пачалася псіхалагічная апрацоўка грамадскай думкі. Будучыя ахвяры аблівалі брудам сваіх жа таварышаў, якія трапілі ў рукі следчых органаў раней за іх. Вышынскі з віртуозным цынізмам выкарыстоўваў гэта потым на судовай трыбуне. Ён здзекаваўся з Радэка, абазваўшага ў друку Зіноўева і Каменева «бандай крывавых забойцаў», з Пятакова, які публічна заклікаў «знішчыць іх як падлу» і ўжо праз пяць месяцаў апынуўся ў ролі «падлы» і «бандыта». У агульны хор неабгрунтаванага абвінавачання ўключыліся і савецкія пісьменнікі. Так, пісьменнік Леў Нікулін назваў Бухарына «камедыянтам», «юродствуючым прахвостам», «трасучай бародкай», а так званую апазіцыю абазваў «зверападобнай брыдотай». Працэсы над «ворагамі народа» мелі мэту ўздзейнічаць не толькі на савецкіх, але і на замежных грамадзян. Пацвярджэннем з'яўляецца наступны вельмі паказальны факт. Сведкам палітычных судовых працэсаў быў нямецкі пісьменнік Л. Фейхтвангер, які ў сваіх занатоўках, каб суняць уласныя сумненні ў справядлівасці судовых працэсаў над ворагамі народу, падае наступнае выказванне савецкіх юрыстаў: «…Мы жадаем, каб увесь народ ад Менска да Уладзівастока зразумеў тое, што адбываецца. Таму мы стараліся абставіць працэс з максімальнай прастатой і яснасцю. Падрабязнае выкладанне дакументаў, паказанняў сведак … можа цікавіць толькі юрыстаў… а нашых савецкіх грамадзян мы толькі б заблыталі … мы вялі гэты працэс не для замежных крыміналістаў. Мы вялі яго для нашага народа» (Пераклад мой. – *А. В.*) [16, с. 114]. Нават такі вядомы палітычны дзеяч Вялікабрытаніі, як У. Чэрчыль, паверыў у здраду Тухачэўскага і іншых ваенных, паверыў працэсам, якія праходзілі ў СССР, і спецыяльны пасол Рузвельта ў Маскве Д. Дэвіс [17, с. 132].

Пры падрыхтоўцы і правядзенні кожнага з працэсаў следчыя шляхам незаконных метадаў здабывалі дадзеныя для наступнага судзілішча. Суд меў толькі прызнанні і паказанні, на працэсах не былі прад'яўленыя дакументы, матэрыялы, якія б пацвярджалі злачынныя мэты абвінавачаных, іх сувязь з замежнымі разведкамі, спробы рэстаўраваць капіталізм, арганізаваць замахі на правадыроў і іншае. У такіх абставінах Вышынскі сцвярджаў, што суд меў справу з палітычнай змовай і змоўшчыкамі, і з гэтай прычыны «характар дадзенай справы такі, што менавіта гэтым характарам абумоўліваецца своеасаблівасць магчымых па справе доказаў» (Пераклад мой. – *А. В.*) [18, с. 100]. Калі Яжоў павінен быў ліквідаваць «ворагаў народа», то Вышынскі – забяспечыць працэс адпаведным юрыдычным і ідэалагічным антуражам. Пры выяўленні «ворага народа» з'яўлялася магчымасць растлумачыць і правалы, дапушчаныя ў выніку няўмелага гаспадарання. «Цяпер ясна, – заявіў Вышынскі 11 сакавіка 1938 г., – чаму тут і там у нас перабоі, чаму раптам у нас пры багацці прадуктаў няма таго, няма другога, няма дзясятага. Менавіта таму, што вінаватыя ў гэтым вось гэтыя здраднікі… Гэта давала ім глебу для стварэння настрояў супраць усёй сістэмы нашага гаспадарчага кіравання, супраць усёй сістэмы Савецкай улады» [16, с. 115].

З сярэдзіны 1950-х гадоў у савецкай навуцы замацавалася звыклае палажэнне: тэарэтычныя памылкі Вышынскага прывялі да парушэння законнасці. Ці так гэта? А можа, наадварот, патрэбнасць у такіх парушэннях вымусіла падвесці пад іх магутны падмурак. Стварыць яго мог толькі такі эрудыт, якім быў акадэмік Вышынскі. Менавіта «практычная патрэбнасць» выклікала неабходнасць прапановы Вышынскім палажэння аб тым, што прызнанне абвінавачанага з'яўляецца лепшым і рашаючым доказам яго віны; сцвярджэння, што «ўмовы судовай дзейнасці ставяць суддзю ў неабходнасць вырашаць пытанне не з пункту гледжання ўстанаўлення абсалютнай ісціны, а з пункту гледжання ўстанаўлення максімальнай верагоднасці тых ці іншых фактараў, падлеглых судовай ацэнцы» (Пераклад мой. – *А. В.*) [19, с. 20]. Пра тое, хто, Яжоў ці Вышынскі, больш паспяхова спраўляўся са сваёй роляй, можна меркаваць па адным факце: пад заслону рэпрэсій першага ліквідавалі, а другі перайшоў на іншую працу.

31 мая 1939 г. А. Я. Вышынскі быў зацверджаны на пасаду намесніка старшыні Саўнаркама СССР, а ў 1940 годзе стаў адначасова і намеснікам народнага камісара замежных спраў. На дыпламатычнай працы ён заставаўся больш за 14 гадоў. Засталіся як хвалебныя, так і больш стрыманыя характарыстыкі Вышынскага як дыпламата. «Дыпламатыі, – пісаў А. Грамыка, – ён ніколі не вучыўся і фактычна да яе не прылучыўся… Ён прапаноўваў фармулёўкі, падобныя на прыгаворы суда, вынесеныя ўжо пасля таго, як віна падсуднага "даказана"… Станавілася ясна, што Вышынскі і ў дадзеным выпадку не расставаўся з тым ходам думак, які ён шматкратна выкарыстоўваў у час вядомых судовых працэсаў … прапускаючы ўсё праз сваё юрыдычнае сіта» (Пераклад мой. – *А. В.*) [20, с. 301-302]. Былы супрацоўнік Міністэрства замежных спраў В. Ісраэлян успамінаў: «…былы пракурор вёў сябе на міжнародных канферэнцыях зусім не як на сходзе прадстаўнікоў суверэнных дзяржаў, а як на судовым пасяджэнні. І да сваіх замежных калег ён звяртаўся адпаведна… Я ўпэўнены, сапраўдным дыпламатам ён ніколі не быў, з'яўляючыся чалавекам нецярплівым, грубым, запальчывым» (Пераклад мой. – *А. В.*) [21, с. 291, 293]. Таму і на міжнародных форумах нярэдкімі былі такія выразы, як «заўзяты падпальшчык вайны», «грубы фальсіфікатар», «вар'ят», «гнюсны паклёпнік». Ацэнкі выступленняў прадстаўнікоў дзяржаў ён даваў часам такія: прамова канадскага дэлегата «ўяўляла сабой каскад непрыстойных слоў і істэрычных выкрыкаў», кіраўнік бельгійскай дэлегацыі «плёў несусветную лухту», а кіраўнік аўстрыйскай дэлегацыі прывёў

факты, якія «з'яўляюцца базарнымі плёткамі і хлуснёй, дастойнай знакамітага барона Мюнхаўзэна» (Пераклад мой. – *А. В.*) [21, с. 294].

Давер Сталіна да Вышынскага быў ледзь не бязмежным. Невыпадкова ён назначыў Вышынскага кіраваць «урадавай камісіяй на Нюрнбергскім працэсе, каб ні пры якіх абставінах не дапусціць публічнага абмеркавання любых аспектаў савецка-германскіх адносін ў 1939–1941 гадах, перш за ўсё самога факта наяўнасці, а тым больш зместу так званых «сакрэтных пратаколаў» (Пераклад мой. – *А. В.*), якія дапаўнялі пакт аб ненападзенні (23 жніўня 1939 года) і дагавор аб дружбе (28 верасня 1939 г.) [22, с. 12–13]. Такім чынам, застаючыся ў Нюрнбергу быццам бы за кулісамі (галоўным абвінаваўцам ад СССР быў Р. А. Рудэнка), менавіта Вышынскі ставіў кропкі над «і» ў дзеяннях савецкай дэлегацыі. Цяпер зразумела, чаму галоўны абвінаваўца ад Вялікабрытаніі лорд Шоукрос называў яго «асобаўпаўнаважаным Сталіна» [1, с. 242].

4 сакавіка 1949 г. Вышынскага прызначылі міністрам замежных спраў СССР. Яго роля ў знешнепалітычных справах прыкметна ўзмацнілася, а стыль кіраўніцтва будаваўся на тым, каб «трымаць людзей у пастаянным хваляванні» (Пераклад мой. – *А. В.*) [23, с. 391]. Як успамінаў А. Грамыка, ён «выклікаў супрацоўнікаў і пачынаў размаўляць на высокай ноце, – звычайна з папроку, а то і з лаянкі. Такая манера ... прымянялася і з пасламі, і з пасланнікамі. Ён лічыў, што спачатку на чалавека патрэбна нагнаць страху, а потым ужо ў такой атмасферы запалоханасці абмеркаваць пытанне па сутнасці. Я ведаў, што ў гэтым ён любіў браць прыклад з Берыі, з якім сістэматычна падтрымліваў кантакты» (Пераклад мой. – *А. В.*) [20, с. 300]. На гэта звярнуў увагу і савецкі дыпламат Беражкоў. Ён пісаў: «Вышынскі быў вядомы сваёй грубасцю з падначаленымі, здольнасцю наводзіць страх на навакольных. Але перад вышэйшым начальствам трымаўся лісліва, угодліва... Вышынскі асабліва баяўся Берыі і Дэканозава. Апошні нават пры людзях называў яго не інакш як «гэты меншавік». Тым больш страх адчуваў Вышынскі ў прысутнасці Сталіна і Молатава. Калі тыя яго выклікалі, ён уваходзіў да іх прыгнуўшыся, неяк бачком, з ліслівай ухмылкай, якая натапырвала яго рыжаватыя вусікі» (Пераклад мой. – *А. В.*) [24, с. 226].

**Заканчэнне**

5 сакавіка 1953 г., у дзень смерці Сталіна, Вышынскі быў выведзены з Прэзідыума ЦК і звольнены з пасады міністра замежных спраў СССР. Ён стаў пастаянным прадстаўніком краіны Саветаў пры ААН і адначасова з'яўляўся першым намеснікам міністра замежных спраў Саюза ССР. Як чалавек разумны, Вышынскі адчуваў, што рэабілітацыя невінавата загінуўшых не за гарамі і яму непазбежна прыйдзецца даваць справаздачу аб сваёй дзейнасці на пасту пракурора СССР. Лёс распарадзіўся інакш. 22 лістапада 1954 г. у Нью-Ёрку Вышынскі памёр ад сардэчнага прыступу. Урна з яго прахам пахавана ў Крамлёўскай сцяне на Чырвонай плошчы ў Маскве.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Звягинцев, А. Г. От первого прокурора России до последнего прокурора Союза / А. Г. Звягинцев, Ю. Г. Орлов. – М. : Олма-Пресс, 2001. – 383 с.
2. Боффа, Дж. История Советского Союза. От революции до второй мировой войны. Ленин и Сталин. 1917–1941 гг. : в 2 т. – Т. 1 / Дж. Боффа ; пер. с итал. И. Б. Левина. – М. : Междунар. отношения, 1990. – 629 с.
3. Соломон, П. Советская юстиция при Сталине : пер. с англ. / П. Соломон. – М. : Рос. полит. энцикл., 1998. - 464 с.
4. Ваксберг, А. Страницы политической биографии // Инквизитор: Сталинский прокурор Вышинский / А. Ваксберг ; сост. и общ. ред. д-р юрид. наук, проф. О. З. Кутафина. – М. : Республика, 1992. - С. 3–87.
5. Конквест, Р. Большой террор / Р. Конквест // Нева. – 1990. – № 9. – С. 118–142.
6. Викторов, Б. А. Без грифа «Секретно»: Записки военного прокурора / Б. А. Викторов. – М. : Юрид. лит, 1990. – 336 с.
7. Вышинский, А. Я. Судебные речи / А. Я. Вышинский. – М. : Юрид. изд-во МЮ СССР, 1948. – 539 с.
8. О так называемом «паралельном антисоветском троцкистском центре» // Известия ЦК КПСС. – 1989. - № 9. – С. 30–50.
9. Хрисанфов, В. И. История государства и права России. 1917–1999 гг. : курс лекций / В. И. Хрисанфов. – СПб. : Лань, 1999. – 224 с.
10. Касцюк, М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусі / М. Касцюк. – Мінск : Экаперспектыва, 2000. – 308 с.
11. Кудрявцев, В. Политическая юстиция в СССР / В. Кудрявцев, А. Трусов. – М. : Наука, 2000. – 365 с.
12. Ваксберг, А. Царица доказательств / А. Ваксберг // Лит. газета. – 1988. – 27 янв. № 4. – С. 13.
13. Судебный отчет по делу антисоветского «право-троцкистского блока» (2–13 марта 1938 г.). – М. : НКЮ СССР, 1938. – 384 с.
14. Белади, Л. Сталин : пер. с венгр. / Л. Белади. – М. : Изд-во полит. лит., 1989. – 318 с.
15. Платонаў, Р. «Ворагі народа» ў люстэрку гісторыка-сацыялагічнага аналізу / Р. Платонаў // Беларус. мінуўшчына. – 1994. – № 2. – С. 37–39.
16. Вішнеўскі, А. Ф. Асаблівасці палітыка-прававога рэжыму савецкай дзяржавы і яго вытокі (1917–1953 гг.) / А. Ф. Вішнеўскі. – 2-е выд., выпр. і дап. – Мінск : Тэсей, 2006. – 328 с.
17. Черчилль, У. Вторая мировая война / У. Черчилль. – Т. 1. – М. : Воен. изд-во, 1991. – 592 с.
18. Борисов, А. Путь наверх / А. Борисов // Инквизитор: Сталинский прокурор Вышинский / сост. и общ. ред. д-р юрид. наук, проф. О. З. Кутафина. М. : Республика, 1992. – С. 8–100.
19. Вышинский, А. Я. Проблема оценки доказательств в советском уголовном процессе. Проблемы уголовной политики. Кн. IV / А. Я. Вышинский. – М. : Юрид. изд-во НКЮ СССР, 1937. – С. 13–38.
20. Громыко, А. «Загадка» Вышинского / А. Громыко // Инквизитор: Сталинский прокурор Вышинский / сост. и общ. ред. д-р юрид. наук, проф. О. З. Кутафина. – М. : Республика, 1992. – С. 296–304.
21. Исраэлян, В. Обличитель / В. Исраэлян // Инквизитор: Сталинский прокурор Вышинский / сост. и общ. ред. д-р юрид. наук, проф. О. З. Кутафина. – М. : Республика, 1992. – С. 288–295.
22. Фляйшхауэр, И. Пакт. Гитлер, Сталин и инициатива германской дипломатии. 1938–1939 / И. Фляйшхауэр ; пер. с нем. – М. : Изд-во Прогресс, 1991. – 480 с.
23. Гордиевский, О. КГБ: история внешнеполитических операций от Ленина до Горбачева / О. Гордиевский. – М. : Note Bene, 1992. – 767 с.
24. Бережков, В. М. Как я стал переводчиком Сталина / В. М. Бережков. – М. : ДЭМ, 1993. – 400 с.


18.01.2018